# Пра песняра Радзімы сінявокай…

**Віртуальная выстава кніг, прысвечаных жыццю і творчасці Якуба Коласа, з фонда бібліятэкі ім. Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі**



**да 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі**

Спадчына Якуба Коласа – паэта, празаіка, драматурга, крытыка, публіцыста, перакладчыка, вучонага, яго жыццёвы шлях заўсёды былі ў цэнтры ўвагі беларускіх літаратурзнаўцаў і навукоўцаў. Вывучэннем жыцця і творчасці Якуба Коласа многія гады плённа займаецца адна з самых актыўных галін беларускай літаратурнай навукі – коласазнаўства. А пачалося вывучэнне яшчэ ў далёкім 1906 годзе, калі адбыўся літаратурны дэбют паэта вершам “Наш родны край” і мінская газета “Голос провинции” змясціла водгук Дарафея Бохана: “Верш вызначаецца выдатным гучаннем і прыгажосцю”. Арыгінальнасць таленту Якуба Коласа падкрэсліваў Напалеон Чарноцкі ў газеце “Минский курьер” (1908).

Сістэматычнае вывучэнне творчасці Коласа пачалося пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1920 годзе ў выдадзенай у Вільні “Гісторыі беларускай літаратуры” Максіма Гарэцкага Колас быў названы вядучым прадстаўніком рэалістычнага накірунку, класікам беларускай літаратуры, адным з заснавальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы.

У фондзе бібліятэкі імя Д. Р. Новікава захоўваюцца кнігі, якія прысвечаны біяграфіі паэта і яго літаратурнай дзейнасці. Трэба адзначыць, што кнігі гэтыя самыя розныя – ад невялікіх папулярна-пазнавальных брашур да сур'ёзных літаратуразнаўчых прац. Гэта выданні, у якіх сабраны цёплыя, усхваляваныя водгукі, цікавыя і трапныя выказванні аб Якубе Коласе і яго творчасці тых людзей, з якімі ён быў знаёмы, і гэта кнігі энцыклапедычнага характару, у якіх даследуецца ўсё, што звязана з імем народнага песняра. Дзякуючы гэтым выданням мы і ў XXI стагоддзі маем магчымасць атрымаць поўнае і глыбокае ўяўленне пра нацыянальную адметнасць класіка, пра яго феномен і ўнікальнасць.

Наяўнасць такіх кніг у нашым фондзе зноў нагадвае аб яго ўніверсальнасці і living разнабаковасці. Кожнаму чытачу, які захоча падрабязна даведацца аб фактах біяграфіі паэта, аб асаблівасцях яго мастацкага стылю гэтыя выданні стануць добрымі памочнікамі. Знаёмцеся з імі зараз і прыходзьце за гэтымі кнігамі ў бібліятэку акадэміі імя Д. Р. Новікава!







У фондзе бібліятэкі акадэміі захоўваюцца кнігі, прысвечаныя жыццю і творчасці Якуба Коласа, якія выхадзілі з друку ў 50-ыя гады мінулага XX стагоддзя. На слайдзе вокладка адной з іх – “Якуб Колас. Жыццё і творчасць” (аўтар Ю. С. Пшыркоў), якая выйшла ў выдавецтве Акадэміі навук БССР у 1951 годзе.









Яшчэ адна кніга, якая датуецца гэтым часам – “Вобраз станоўчага героя ў творчасці Якуба Коласа”. Выйшла таксама ў выдавецтве Акадэміі навук Беларускай ССР. Аўтар – М. Н. Барсток.



*“Яго светлая і чаруючая паэзія – гэта дыханне народа, увасабленне яго мудрасці, яго любві да жыцця, да працы, яго спрадвечнага імкнення да свабоды і шчасця чалавека”.*

*Міхась Лынькоў*




Да сямідзесяцігоддзя з дня нараджэння Якуба Коласа ў межах Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларускай ССР была падрыхтавана брашура аб жыцці і творчасці класіка беларускай літаратуры. Аўтар – член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР Міхась Лынькоў. Выйшла ў 1952 годзе ў выдавецтве АН БССР.









У юбілейны 1952 год у розных выдавецтвах выйшла таксама некалькі кніг на рускай мове, прысвечаных Якубу Коласу. Гэта крытыка-біяграфічны нарыс Юрыя Пшыркова “Якуб Колас” (выдавецтва АН БССР) і кніга Яўгенія Мазалькова, якую выпусціла маскоўскае выдавецтва “Советский писатель”. (на наступным слайдзе)




ЯКУБ КОЛАС


ЕВГ. МОЗОЛЬКОВ
ЯКУБ
КОЛАС
Критико-биографический
очерк
Белорусской
Отд. 928
К60 Я.К.
280471
Академии
ПИСАТЕЛЬ
А·1952


928
К60 Я.К
280471
ЕВГ. МОЗОЛЬКОВ
ЯКУБ
КОЛАС



ЯКУБ КОЛАС



АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

А. А. СЕМЯНОВІЧ

ПРОЗА
ЯКУБА КОЛАСА

(ДАКАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРЫЯД)

Белорусской
ТД. 891.72
Шифр С. 309 п.я.
Инв. № 147601

ВЫДАВЕЦТВА АН БССР
МІНСК 1953

Зноў жа ў выдавецтве Акадэміі навук БССР (1953 год) выйшла даследванне прозы Якуба Коласа дакастрычніцкага перыяду. Аналізуючы творчасць гэтага часу, аўтар Аляксандр Семяновіч робіць вывад аб тым, што дакастрычніцкія творы “з’явіліся падрыхтоўчым этапам для стварэння наступных манументальных твораў у прозе”.











АН

Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і літаратурны музей Якуба Коласа АН БССР падрыхтавалі вялікі, багата ілюстраваны альбом прысвечаны жыццю і творчасці Якуба Коласа. Выданне ажыццявіла Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР у 1959 годзе.














У 1960 годзе выдавецтва “Советский писатель” перавыдала дапоўнены крытыка-біяграфічны нарыс Яўгенія Мазалькова “Якуб Колас” на рускай мове.




## АД АЎТАРА

Гэта кніга з'явілася вынікам падарожжаў па мясцінах, звязаных з жыццём нашага народнага песняра, выдатнага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Якуба Коласа. Аўтар не ставіў задачы асвятліць на старонках кнігі ўсіх падзей, непасрэдным удзельнікам якіх быў Якуб Колас. Жыццё народнага паэта настолькі мнагаграннае і багатае падзеямі, што цяжка паказаць іх у падрабязнай паслядоўнасці. Аўтар абмежаваў сваю мэту спробай паказаць Якуба Коласа як чалавека, які заўсёды і ўсюды ў думках і сэрцы быў з родным краем, які ніколі не адасабляў сваіх інтарэсаў ад інтарэсаў народа. Сустрэчы з людзьмі, з якімі быў знаёмы Якуб Колас, з людзьмі, да якіх ён меў тое ці іншае дачыненне, дапамаглі нам узнавіць цікавыя факты і асобныя дэталі з жыцця паэта. Гэта ўсё дае магчымасць пераканацца, наколькі цікавымі і шырокімі былі яго духоўныя інтарэсы, наколькі чулым і сардэчным быў Якуб Колас як чалавек. Але ўсё тое, што падаецца ў гэтай кніжцы, з'яўляецца толькі сціплай часцінай у асвятленні жыццёвай біяграфіі нашага незабыўнага і дарагога дзядзькі Якуба, як называлі і называюць яго пісьменнікі малодшага пакалення і беларуская літаратурная моладзь.

Да слоў "Ад аўтара" застаецца толькі дабавіць тое, што кніга была выдадзена ў 1961 годзе ў выдавецтве Акадэміі навук БССР.







На слайдзе вокладка зборніка матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа, прысвечанага 80-годдзю з дня яго нараджэння. У ім шырока прадстаўлены ўспаміны пісьменнікаў Беларусі і брацкіх рэспублік, шматлікія выказванні чытачоў і вершы, прысвечаныя памяці народнага паэта БССР. Зборнік быў выдадзены выдавецтвам Акадэміі навук БССР у 1962 годзе.



## Вось некаторыя вершы з гэтай кнігі

*Аляксандр Пракоф'еў*

### *БАЯВОЕ, МАГУТНАЕ СЛОВА*

*Узляцеўшы з наднёманскіх ціхіх дуброў,*
*Дружбай шчырай і ласкай сагрэтае,*
*Ты знаходзіш у роднай краіне сяброў,*
*Акрылёнае слова паэта.*

*Гэта слова сягоння не знае граніц,*
*Гэта заклік да подзвігаў новых.*
*Нібы голас народа, усюды грыміць*
*Баявое, магутнае слова.*

*То крыніца, што ласкаю поіць лугі,*
*То вытокі ракі ўсенароднай,*
*Што крышыла варожыя ушчэнт ланцугі*
*І пад сонцам бруіцца свабодна.*

*Слова майстра узрушыла сэрцы ва ўсіх,*
*Майстра мае вялікае сэрца, –*
*Той, якому ты дружбу навек аддасі,*
*І любоўю яна адзавецца.*

Пераклад з рускай мовы А. Вялюгіна

*Іван Навуменка*

### *БЫВАЙ, НАШ ПАЭЦЕ*

*Замоўк нечакана твой голас прарочы.*
*У жальбе, у смутку наш край, –*
*Закрыліся ясныя, добрыя вочы,*
*Бывай, наш паэце, бывай…*

*У дні ліхалецця ты зваў на свабоду*
*Праз буры, праз бездань нягод.*
*Служыў ты вялікую службу народу*
*Для волі, для шчасця яго.*

*Твой голас Кастрычнік узняў па-над светам,*
*І мары твае расцвілі.*
*І песня лунала над цэлай планетай,*
*Што ёсць Беларусь на зямлі!*

*Ты – наша слава, паэзіі сонца.*
*Цябе не забудзе наш край,*
*Твой голас бяссмертны – праўдзівы бясконца.*
*Бывай, наш паэце, бывай…*


ТАВАРЫСТВА ПА РАСПАЎСЮДЖВАННЮ ПАЛІТЫЧНЫХ
І НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

У. М. КАЗБЯРУК

928
К 60
363736

ЯКУБ КОЛАС
(жыццё і творчасць)

№ 13

МІНСК 1962




У брашуры апавядаецца аб жыццёвым і творчым шляху аднаго з заснавальнікаў беларускай савецкай літаратуры — народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, 80 год з дня нараджэння якога спаўняецца 3 лістапада 1962 года.

Аўтар разглядае асноўныя этапы творчага росту пісьменніка ў дарэвалюцыйны перыяд і пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Асаблівая ўвага звернута на аналіз такіх буйных твораў Я. Коласа, як паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях», аповесць «Дрыгва» і іншыя.

Брашура разлічана на шырокае кола чытачоў.

Брашура была выдадзена ў межах працы Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларускай ССР у 1962 годзе.









Аўтару гэтай кнігі, аднавяскоўцу і земляку Якуба Коласа, доўгі час давялося жыць і працаваць сярод блізкіх і родных паэта, сустракацца і гаварыць з людзьмі, якія добра ведалі народнага песняра і ўсё жыццё былі з ім у дружбе і шчырых сяброўскіх адносінах. Уладзімір Міцкевіч імкнуўся расказаць пра Якуба Коласа праз успаміны яго родных, блізкіх і аднавяскоўцаў. Кніга выйшла ў выдавецтве “Народная асвета” у 1964 годзе.






Кніга Максіма Лужаніна выйшла ў 1964 годзе ў выдавецтве “Беларусь”. Яна ўяўляе сабой развагі Якуба Коласа аб жыцці, аб літаратуры і адначасова адлюстроўвае ўражанні аўтара ад сустрэч з народным паэтам Беларусі. Кніга таксама была выдадзена на рускай мове ў выдавецтве “Советский писатель”. Пераклаў на рускую мову Яўген Мазалькоў (фота на наступным слайдзе).





Кр. 76

МАКСИМ ЛУЖАНИН

# ЯКУБ КОЛАС РАССКАЗЫВАЕТ...

АВТОРИЗОВАННЫЙ ПЕРЕВОД С БЕЛОРУССКОГО
Е. МОЗОЛЬКОВА

БИБЛИОТЕКА ... АКАДЕМИИ
928
К 60 я.к
№ 467841

СОВЕТСКИЙ ПИСАТЕЛЬ
МОСКВА • 1964







І яшчэ адна кніга на рускай мове – “От родной земли”. Гэта повесць аб дзіцячых і юнацкіх гадах будучага паэта і пісьменніка, якую напісаў Сцяпан Александровіч. Кніга выйшла ў выдавецтве “Беларусь” у 1966 годзе.









Якуб Колас каля трыццаці год працаваў на ніве народнай асветы: вучыў дзяцей і дарослых, ствараў школы і бібліятэкі, праводзіў вялікую асветніцкую работу. Аб яго педагагічнай дзейнасці і расказваюць артыкулы, сабраныя ў гэтай кнізе. Выйшла яна ў выдавецтве “Народная асвета” у 1966 годзе.





# ЯКУБ КОЛАС

ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ВЫСТАЎКІ Ў ШКОЛЕ

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»
МІНСК 1967





1 верасня 1906 года газета „Наша доля“ надрукавала верш Якуба Коласа „Наш родны край“. Гэта было першае выступленне паэта ў друку. У другім нумары „Нашай долі“ з'явілася і першае апавяданне Коласа „Слабода“.



Верш «Наш родны край» і апавяданне «Слабода» на старонках газеты «Наша доля».

*“Якуб Колас сваёй творчасцю ахоплівае дзве эпохі жыцця беларускага народа: эпоху змагання за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і светлы шлях народа пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі… Уся творчасць вялікага паэта ёсць найглыбейшае адлюстраванне жыцця беларускага народа за некалькі самых бурных і яркіх дзесяцігоддзяў яго гісторыі”.*

*Кузьма Чорны*



Выдавецтва “Народная асвета” у 1967 годзе выпусціла матэрыялы для выстаўкі ў школе аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа. У выданні выкарыстана шмат фотаздымкаў, дакументаў, урыўкаў з твораў Якуба Коласа, выказванняў аб ім пісьменнікаў і паэтаў.







Кніга прысвечана жыццю, літаратурнай і грамадскай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. У ёй раскрываецца веліч таленту выдатнага пісьменніка, даследуюцца яго класічныя творы. Значнае месца займаюць успаміны пра Якуба Коласа людзей, якія блізка яго ведалі. Кніга выйшла ў выдавецтве “Навука і тэхніка” у 1967 годзе.









У сваёй аповесці “На шырокі прастор” Сцяпан Александровіч расказвае аб дзіцячых і юнацкіх гадах будучага паэта, пра нялёгкія жыццёвыя дарогі і творчую працу вялікага сына беларускай зямлі. Кніга выйшла ў мінскім выдавецтве “Мастацкая літаратура” у 1972 годзе.


928
К·60 я.к
753008

ПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» БЕЛАРУСКАЯ ССР

Навукова-метадычны савет па прапагандзе пытанняў літаратуры і мастацтва

С. А. ПЯТРОВІЧ,
кандыдат мастацтвазнаўства

ЯКУБ КОЛАС
І БЕЛАРУСКІ ТЭАТР

(Да 90-годдзя з дня нараджэння.
Матэрыял у дапамогу лектару)

МІНСК, 1972

Якуб Колас пакінуў значны след у драматургіі, у гісторыі беларускага тэатра. Ён шмат працаваў з маладымі драматургамі, дапамагаў ім, актыўна ўдзельнічаў у культурным жыцці рэспублікі. Якуб Колас шмат сустракаўся з артыстамі, рэжысёрамі, мастакамі, музыкантамі. Тэатральнае мастацтва рэспублікі з пашанай адносіцца да коласаўскай спадчыны, а адзін са старэйшых нацыянальных тэатраў (у Віцебску) з гонарам носіць яго імя. У брашуры аўтар і расказвае аб вялікім уплыве творчасці Якуба Коласа на тэатральнае мастацтва Беларусі. Дадзеная брашура выйшла ў таварыстве “Веды”. А ў 1975 годзе гэты ж аўтар ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” выпусціў кнігу “Якуб Колас і беларускі тэатр”, дапоўненую новымі матэрыяламі і шматлікімі фотаздымкамі. Кніга прадастаўлена на наступным слайдзе.








Сцэна са спектакля «Навальніца будзе»

Сцэна з тэлеспектакля «І смех і бяда».
У ралях: стражніка — заслужаны артыст БССР А. Мілаванаў, ураднiка — заслужаны артыст БССР Г. Дубаў, соцкага — народны артыст БССР Г. Аўсяннікаў.





Сцэна з кінафільма «Першыя выпрабаванні».

Пралог са спектакля «Навальніца будзе» А. Звонака.





Сцэна з оперы А. Багатырова «У пушчах Палесся». У ролі Аўгінні С. Друкер, У ролі Саўкі П. Засецкі.




Афіша спектакля «У пушчах Палесся».





У 1974 годзе выдавецтва “Народная асвета” выпусціла кнігу “Якуб Колас. Жыццё і творчасць”. Кніга з’яўляецца падарожжам у свет ідэй і вобразаў вялікага мастака слова, у жыццё і працу чалавека высокай душы. Са старонак кнігі перад намі паўстае акружаны народнай любоўю мастак, дзеяч з шырокім грамадскім клопатам, выдатны вучоны і педагог, чулы і добры чалавек. У кнізе выкарыстана шмат фотаздымкаў, дакументаў, урыўкаў з твораў песняра.

# Прывядзём некаторыя выказванні аб Якубу Коласу, якія таксама змешчаны ў гэтай кнізе.



Я. Колас. 1952.

Паўстагоддзя Вы ідзяце ў першых радах мастацкага слова, уносячы свой уклад у перадавую савецкую мастацкую літаратуру. Сваімі высокамастацкімі творамі Вы апяваеце мужнасць савецкіх людзей — будаўнікоў камунізма, велічныя перамогі Камуністычнай партыі і савецкага народа ў яго барацьбе за светлую будучыню, праслаўляеце прыгажосць, сілу і магутнасць сацыялістычнай Радзімы.
Усё Ваша жыццё і дзейнасць пісьменніка, народнага дэпутата, вучонага, педагога ёсць прыклад самаадданага і беззапаветнага служэння савецкаму народу, сацыялістычнай Айчыне.

*Савет Міністраў Беларускай ССР,*
*Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР,*
*Цэнтральны Камітэт КП Беларусі*

Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР шле Вам, выдатнаму беларускаму пісьменніку, аднаму з заснавальнікаў савецкай беларускай паэзіі найлепшыя пажаданні ў дзень Вашага сямідзесяцігоддзя. Вашы творы ўвайшлі ў залаты фонд многанацыянальнай літаратуры і заваявалі прызнанне і любоў народаў Савецкага Саюза.

*Праўленне ССП СССР*

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

**Аб узнагароджанні пісьменніка Якуба Коласа ордэнам Леніна**

За выдатныя заслугі ў развіцці савецкай мастацкай літаратуры, у сувязі з 70-годдзем з дня нараджэння, узнагародзіць пісьменніка Якуба **Коласа** ордэнам **Леніна.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Н. ШВЕРНІК.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква. Крэмль
3 лістапада 1952 г.

146

*Канстанцін Міхайлавіч заўсёды быў у першых радах савецкай літаратуры. Успрыняўшы лепшыя дэмакратычныя традыцыі дарэвалюцыйнай паэзіі – традыцыі вялікіх Пушкіна, Някрасава, Шаўчэнкі, Кансатнцін Міхайлавіч паспяхова прадаўжаў і развіваў іх на новай аснове.*

*Міхаіл Ісакоўскі*

*Вялікі сын свайго народа, класік яго літаратуры, майстар яго роднай мовы. Колас належыць да ліку людзей, жыццёвая праца якіх абвяшчала новыя, лепшыя часы для свайго і для іншых братніх народаў. Гэта забяспечвае вечную трываласць яго творчасці.*

*Леон Кручкоўскі*

*У яго вершах такія мастацкія звароты і вобразы, такія яркія, праўдзівыя карціны беларускай прыроды, што, здаецца, складаў іх сам народ. Яго паэзія шчырая, як сама народная песня. Вось чаму вершы Коласа так лёгка кладуцца на інтанацыі беларускай народнай музыкі… Мудры эпас і натхнёная лірыка Якуба Коласа – невычэрпная крыніца для творчасці беларускіх кампазітараў ва ўсіх жанрах.*

*Рыгор Шырма*




*Ляжыць шырокая дарога.
Вакол прастор, і я іду,
Іду, нясу пачуццяў многа
І ясных думак чараду…*

*Цвітуць палі ў адзенні новым,
Гадуюць новыя сады.
І нават вецер з-пад дубровы
Шуміць на новыя лады.*

*Глядзіш – узносяцца будынкі
То з той, то з гэтай стараны,
І цешаць вочы мне навінкі.
І сэрца радуюць яны…*

*Шумяць па-новаму дубровы,
На край свой люба мне зірнуць.
Цябе, зямля ў адзенні новым,
Хацеў бы к сэрцу прыгарнуць!*

Кніга выйшла ў мінскім выдавецтве “Беларусь” у 1974 годзе. Для знаёмства з лёсам і творчай біяграфіяй Якуба Коласа складальнікі выкарысталі шмат фотаздымкаў і аўтабіяграфію паэта і пісьменніка. Прыводзяцца таксама яго вершы.



У 1982 годзе, калі ў Беларусі шырока адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа, рознымі выдавецтвамі былі падрыхтаваны і выдадзены самыя разнастайныя кнігі, прысвечаныя жыццю і творчасці народнага паэта Беларусі. Пазнаёмімся з тымі, што захоўваюцца ў фондах бібліятэкі акадэміі.







У першую чаргу хацелася б прадставіць кнігу, у якую ўвайшлі дакументы і матэрыялы аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа. У зборніку публікуюцца дакументы аб паходжанні паэта, яго вучобе, творчай і службовай дзейнасці, удзеле ў рэвалюцыйным і грамадскім руху, яго ўкладзе ў беларускую культуру. Кніга выйшла ў выдавецтве “Навука і тэхніка”. Укладальнікам з’яўляецца Г. В. Кісялёў.









У гэтым жа выдавецтве выйшла і кніга “Летапісец свайго народа” Ю. С. Пшыркова. Аўтар разглядае творчасць выдатнага пісьменніка Беларусі на фоне вялікіх гістарычных падзей мінулага XX стагоддзя, глыбока аналізуе прызнаныя дасягненні беларускай літаратуры: паэмы “Новая зямля”, “Сымон-музыка”, трылогіі “На ростанях”.






Якуб Колас, Аляксандр Фадзееў, Пятрусь Броўка. 1948.



Аркадзь Куляшоў і Якуб Колас. 1949.



Янка Купала і Якуб Колас



Якуб Колас, Марыя Дзмітрыеўна і сыны: Даніла, Юрка, і Міхась.



У юбілейны 1982 год выдавецтва “Мастацкая літаратура” выпусціла з друку зборнік успамінаў пра Якуба Коласа. У кнізе змешчаны ўспаміны пра народнага паэта Беларусі літаратурных і грамадскіх деячоў, сваякоў і знаёмых. Сярод аўтараў кнігі Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Янка Брыль, Іван Шамякін і іншыя. Тэкст кнігі дапоўнены шматлікімі фотаздымкамі.

*Мы вылятaлі з-пад твайго крыла,*
*Як птушаняты, у палёт свой першы.*
*І праз гады нас вабіла, вяла*
*Пявучая і поўная святла*
*Паэзія і праўда тваіх вершаў.*
*Няхай нам тых не дасягнуць высот,*
*Дзе ты лунаў, нібы арол свабодны.*
*Ты навучыў нас, як любіць народ.*
*Як з ім ісці плячо ў плячо ўпярод*
*І як адданым быць краіне роднай!*

*Эдуард Валасевіч*



Віртуальную выставу падрыхтавала
Студнёва Марыя Міхайлаўна,
галоўны бібліятэкар
аддзела гуманітарна-асветніцкай работы
бібліятэкі імя  Д. Р. Новікава